


Інфармацыйная культурна-грамадская газета Гарадоччыны

# ГАСЦІНЕЦ

№ 11 (218) ЛІПЕНЬ 2016 ГОДА


**БЕЛАРУСКАЯ ПРЫКАЗКА**

*Калі не спявалі, то і не весяліліся*

ДЭКЛАРАЦЫЯ

## «ЗА СЛОВА «НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ» – У ПСІХУШКУ»

**26 ліпеня адбылося пасяджэнне «Клуба Вітаўта» па тэме «Абвяшчэнне Незалежнасці». Ганаровы госць клуба дэпутат Вярхоўнага савета БССР Лявон Баршчэўскі распавёў цікавыя акалічнасці прыняцця Дэкларацыі Незалежнасці 27 ліпеня 1990 года.**

**Грамадскія настрої да незалежнасці**

У канцы 80-ых, пачатку 90-га года нават у Фронце (Партыя БНФ — рэд) мы не маглі падумаць, што будзем абвяшчаць незалежнасць. Не, у Зянона Пазняка, я перакананы, гэтае разуменне было ад пачатку, але за такія словы як «незалежнасць», «поўны сувэрэнітэт» і іншыя падобныя можна было патрапіць у псіхушку, таму нават у франтаўскіх дакументах даводзілася ўсяляк завуалёўваць гэтыя паняткі.

**Вярхоўны савет 12 склікання**

На першай жа сэсіі Вярхоўнага савета мы паставілі пытанне аб прыняцці Дэкларацыі незалежнасці. Камуністычная большасць вельмі супраціўлялася і апазіцыі БНФ было вельмі складана: нас было 30 дэпутатаў — толькі 8% ад усяго складу парламанта. Але пры спрыянні знешнепалітычных чыннікаў (напрыклад, план Гарбачова па абвяшчэнні незалежнасці рэспублікамі СССР з тым, каб потым падпісаць новую саюзную дамову) і нашымі агульнымі высілкамі ўдалося прыняць Дэкларацыю незалежнасці.

**Роля Зянона Пазняка**

Абмеркаванне Дэкларацыі пачалося 26 ліпеня 1990 года, але пракамуністычная большасць усяляк перашкаджала прыняцьцю: ішла барацьба літаральна за кожнае слова. І калі 26 ліпеня ў нас яшчэ атрымоўвалася ўносіць праўкі і іх прымалі, то 27 ліпеня савецкая наменклатура згуртавалася (відаць ужо атрымала ўстаноўкі ад КДБ) і не прымала ніводнай нашай прапановы. Тады Зянон Пазняк пайшоў на адчайны і прадуманы крок: з трыбуны Вярхоўнага савета ён агучыў сваю нязгоду з 11 артыкулам Дэкларацыі, у якой абвяшчалася аб перамовах па новай саюзнай дамове. «Я пакідаю гэты зал, а хто мяне падтрымае – гэта справа кожнага, — сказаў Пазняк і далей даў ім выспятка. — Вы ніколі ня прыміце Дэкларацыю, вы да гэтага няздольныя».

І вось з Пазняком пакідаюць памяшканне каля 30 дэпутатаў, але некалькіх, у тым ліку Сяргея Навумчыка, мы пакінулі ў зале — сачыць за тым, што адбываецца. Як толькі Пазняк выйшаў, так іх ушчыпіўшы, яны тут жа пачалі прымаць артыкулы Дэкларацыі, прычым з некаторымі нават нашымі былымі праўкамі. Калі раней Фронт прапаноўваў адзначыць у Дэкларацыі стварэнне свайго войска і гэтую прапанову адрынулі, то потым па прапанове дэпутата камуністычнай большасці гэтая фармулёўка была вернута.

**Вынікі прыняцьця Дэкларацыі незалежнасці**

Дэклярацыя дала нам мажлівасць уносіць многія законапраекты на разгляд парляманта, тыя законы, якія без дэкларацыі проста ніхто не паставіў бы ў парадак дня. У дэкларацыі напісана пра войска — і мы ўносім законапраект пра войска, спасылаючыся на Дэклярацыю і г.д. І хоць юрыдычна Беларусь сталася незалежнаю краінаю толькі 10 снежня 1991 года, калі Вярхоўным саветам была дэнансавана дамова аб утварэнні СССР, 27 ліпеня сталася важным днём у шматвякавой барацьбе беларусаў за незалеэжнасць сваёй дзяржавы.

**Паводле сайта Маладога фронта**

**ЗНАЧНА БОЛЬШ НАВІНАЎ ПРА ГАРАДОК НА HARADOK.INFO**

РЫБАЛОЎСТВА

## ТРЫ ВОЗЕРА ПЕРАДАДЗЕНЫ Ў АРЭНДУ

**Возера Лосвіда, адно з самых буйных на Гарадоччыне, на падставе дамовы перададзена ў арэнду таварыству з абмежаванай адказнасцю «Велес — 88» для арганізацыі прамысловага лова рыбы і платнага аматарскага рыбалоўства.**

У базе даных Дзяржаўнгай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету па стану на 7 ліпеня 2016 года ў Гарадоцкім раёне маецца тры возера, якія перададзены ў арэнду для арганізацыі прамысловага лова рыбы і платнага аматарскага рыбалоўства. Гэта возера Плаў арэнда на якім належыць ПУП па аказанню паслугаў «Паўазер'е», возера Вослепна арэнда на якім належыць Лужаснянскай сортавыпрабавальнай стан-цыі.

Да гэтых двух азёр з 1 чэрвеня дадалася возера Лосвіда, якое на правах арэнды перададзена таварыству з абмежаванай адказнасцю «Велес — 88». Тэрмін арэнды вызначан на 10 гадоў да 31 мая 2026 г. Плошча возера Лосвіда складае 1167 га і гэта чацвёртае па плошчы возера на Віцебшчыны сярод арэндуемых азёр.

Самым вялікім уладальнікам водных аб'ектаў на Віцебшчыны з'яўляецца Нацыянальны парк "Браслаўская азёры, які карыстаецца 57 азёрамі Браслаўшчыны.

**Л. Антонаў**

ЗДАРЭННЕ

## ЗЛАЧЫНЦЫ ПРАЗ ВОКНЫ ЎЧЫНІЛІ КРАДЗЁЖ

**За два дні ў Гарадоцкі РАУС звярнулася двое пенсіянерак з заявамі аб крадзяжы маёмасці з пранікненнем у іх дамы праз вакно.**

Спачатку 85-гадовая пенсіянерка 20 ліпеня ў 14 гадзін 45 хвілін паведаміла дзяжурнаму па РАУС, што ў перыяд з 15-й гадзіне 19 ліпеня да 14 гадзін 20 ліпеня неўсталяваны злачынец, выставіўшы аконную раму, пракраўся ў яе дом. Пры гэтым злачынец здзейсніў крадзеж прадуктаў харчавання і грошай у суме 60 рублёў . Учыненая шкода склала 68,6 рублёў.

Потым 21 ліпеня ў 18 гадзін у Гарадоцкі РАУС звярнулася пенсіянерка 1953 года нараджэння. Пенсіянерка паведаміла, што ў перыяд з 10 па 21 ліпеня неўсталяваны злачынец праз незачыненае акно пранік у яго дачны дом. Пры гэтым быў учынены крадзеж спіннінга і спіртных напояў. Шкода склала 100 рублёў.

Гарадоцкі аддзел Следчага камітэта па гэтых фактах узбудзіў дзве крымінальныя справы па ч. 2 арт. 205 КК — крадзёж з пранікненнем у жытло. Па гэтаму артыкулу існуе пакаранне у выглядзе выпраўленчых прац да двух гадоў, або арышт на тэрмін ад 3-х да 6-ці месяцаў, або абмежаванне свабоды да чатырох гадоў, або пазбаўленне волі на гэты ж тэрмін.

**Т. Гаражанка**

**Паводле: uvd.vitebsk.gov.by**

НУ І НУ!

## СЯБРЫ СТАЛІ І ПАЦЯРПЕЛЫМІ, І АБВІНАВАЧАНЫМІ

**Незвычайную крымінальную справу ўзбудзіла раённая пракуратура. Так завяршылася хмельная сустрэча сяброў. Сёння 48-і і 54-гадовы жыхары Гарадка нават не могуць успомніць, з якой прычыны падчас застолля ў іх узнікала сварка. Прэтэнзій адзін да аднаго яны ўжо не маюць.**

Тым не менш, раённая пракуратура распачала крымінальныя справы ў дачыненні да абодвух па факце нанясення імі цялесных пашкоджанняў адзін адному.

Памочнік пракурора Гарадоцкага раёна Яўген Ратохля распавядае:

— Таемнае стала відавочным пасля таго, як адзін з сабутэльнікаў звярнуўся ў лякарню з рэзанай ранай грудной клеткі. Медыкі паведамілі пра здарэнне ў міліцыю, а парэзаны пацыент прызнаўся: злёгку пасварыліся з прыяцелем, які разбіў бутэльку і «ружанькай» ударыў яго ў грудзі. Міліцыянты прыехалі да прыяцелю — той таксама меў на целе сляды бурнага непаразумення. Сябры раней ужо не аднойчы траплялі ў поле зроку праваахоўнікаў. А таму з мэтай прафілактыкі, для папярэджання далейшых парушэнняў закона з іх боку, пракурор раёна прыняў рашэнне аб узбуджэньні крымінальнай справы. Нягледзячы на перамір'е фігурантаў крымінальнай гісторыі.

Цяпер абодва ўдзельніка сяброўскага канфлікту чакаюць суда. Ім пагражае арышт тэрмінам да трох месяцаў. З улікам таго, што абодва беспрацоўныя, у абвінавачаных-пацярпелых з'явіўся шанец у бліжэйшыя тры месяцы заняцца рэальнай справай.

**Алёна Бегунова**

**http://www.sb.by**

## Аб'ява

Аператыўная інфармацыя аб падзеях Гарадоччыны, рэгіёна і больш, чым у газеце, зараз па-беларуску і па-расейску з'яўляецца на новым Інтэрнэт рэсурсе: http://haradok.info

**************

Наша газета "Гасцінец" пачала размешчацца на партале http://haradok.info ў раздзеле "Газета "Гасцінец", дзе ствараецца архіў за мінулыя гады.

**************

Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Гасцінец» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – і вы яго атрымаеце. Калі ўжо не жадаеце атрымліваць выданне, то патэлефануйце у рэдакцыю.

ЭКСПАРТ

# "КАШЭРНАЯ" ГАРЭЛКА З ШУМІЛІНА

**Шумілінскую гарэлку «Partisan» у Германіі рэкламуюць білбордамі з "замілаванымі мужчынамі".**

У Нямеччыне з'явілася рэклама гарэлкі «Partisan», якая выраблеяцца ў горпасёлку Шуміліна, з выявай двух маладых мужчын, якія цалуюцца на фоне сабора Васіля Блажэннага і слоганам «Not The Russian Standard».

Рэклама размешчана на білбордах у Кёльне і Берліне, а таксама на старонцы прадукту ў Facebook, дзе суправаджаецца подпісам «Geht's um Vodka, lieben wir Russland. Geht's um Liebe, sind wir # NotTheRussianStandard», што прыблізна можна перавесці як« Што тычыцца гарэлкі – мы любім Расею. Што тычыцца любові – у нас не рускі стандарт».

Характэрна, што гарэлка гэтага брэнда выраблеяцца не ў Расеі, а ў гарадскім пасёлку Шуміліна Віцебскай вобласці на вытворчым унітарным прадпрыемстве «Славянскі прадукт». На нямецкім сайце брэнда падкрэсліваецца, што беларускі рэгіён заўсёды быў вядомы выключным якасцю сваёй гарэлкі, а гарэлка «Partisan» выраблеяцца з выключна чыстай вады і адборнай пшаніцы. На сайце «Славянскага прадукта» заяўляецца, што гарэлка ў 40 ° – моцная, як сапраўдная мужчынская дружба.

У 2014 годзе гарэлка «Partisan», як і шэраг іншых спіртных напояў гэтага вытворцы, атрымала сертыфікат кашэрнасці. Гэты дакумент выдаў равін іўдзейскай рэлігійнай абшчыны Віцебска Шымшон Даніэль Ізаксон. У ім гаворыцца, што пералічаныя гарэлкі кашэрныя і прыдаюцца ўлюбы дзень года, акрамя свята пэйсы. Праўда, тэрмін дзеяння сертыфіката скончыўся яшчэ ў кастрычніку 2015 года. Магчыма прадпрыемства не змагло яго падоўжыць, так як равін Ізаксон ў пачатку 2016 гады стаў галоўным равінам Вільнюса і з'ехаў у Літву.

**"Наша ніва"**

МАХЛЯРСТВА

# ГОРОДОКЧАНКА ОБМАНЫВАЛА КРЕДИТОРОВ

**В Витебске задержали 38-летнюю жительницу Городка, которая зарабатывала на тех, кто сам наживается на нуждающихся в деньгах, сообщает пресс-служба УВД облисполкома.**

Женщина придумала нехитрую схему: находила объявления людей, которые предлагают деньги в долг. Часто такие предложения подразумевают значительную переплату в конце. К примеру, человек получает небольшую сумму взаймы, идет в салон связи, покупает дорогой мобильный телефон в рассрочку, заплатив первоначальный взнос меньше той суммы, которую взял в долг. Остальные деньги оставляет себе, а телефон отдает кредитору, а сам продолжает платить за него по условиям рассрочки.

Женщина Городка, получая взаймы, ничего покупать не собиралась. Она заходила в салон, а потом сбегала с деньгами через черный ход.

Милиция установила три подобных факта в Витебске и Минске, но полагает, что их могло быть больше.

Возбуждено уголовное дело за мошенничество.

**http://news.tut.by**

РЭЗАНАНСНАЯ СПРАВА

# ЗА ПРОДАЖУ ТЕЛЯТ СУДИЛИ ЦЕЛУЮ ГРУППУ СЕЛЬЧАН

**Это дело в суде Городокского района считают беспрецедентным. На скамье подсудимых — сразу шесть человек. А было их семь — сельчан, которые продали российскому заготовителю телят, выращенных на своих подворьях. Рассчитался скупщик с людьми российской валютой. Правда, один из продавцов заявил о том, что россиянин лично ему заплатил исключительно белорусскими рублями, пишет «Рэспубліка».**

Председатель Городокского райисполкома Петр Коробач сельчанам сочувствует:

— Да, понять сдатчиков, которые хотят свою живность продать как можно выгоднее, можно — как-никак, своими руками вырастили. Но ведь и наши хозяйства молодняк закупают. Вопрос находится под постоянным контролем: и председатель облисполкома эту тему на планерках озвучивает, и мы на совещаниях обсуждаем. Заключаем договоры контрактации, кроме денежного расчета предусматриваем в них и натуральное поощрение — зерном, сеном. Долго ли ждать расчета? Сейчас — в течение месяца. В начале года, конечно, у хозяйств были финансовые проблемы, выплату зарплат задерживали, но теперь все стабильно. Кстати, у жителей района осталось всего 350 коров, мы закупили около 70 телят.

Вроде все понятно. Но интересно, чем же руководствовались нарушители, которых в итоге обвинили в незаконных валютных операциях?

Вместе с начальником управления сельского хозяйства и продовольствия Городокского райисполкома Алексеем Марковским едем на самый край Витебщины — в Полово. По дороге Алексей Анатольевич рассказывает: в сельхозпредприятиях района насчитывается 14,3 тысячи голов крупного рогатого скота. За год поголовье уменьшилось примерно на 700 голов. Вакуум нужно закрывать, а значит, и молодняк сельхозпредприятиями востребован. Другое дело, что не все и не всегда вовремя могут за него рассчитаться.

Деревенька встречает нас заросшими садами, опустевшими домами с заколоченными досками окнами. А еще — разбросанными в разные стороны улочками с дорогами, которые лет пять точно не видели грейдера. На въезде — остовы бывших административных и хозяйственных зданий. Полово уже давно присоединено к крупному сельхозпредприятию, центр которого находится в десяти километрах. Работать, кроме как на маленькой ферме, в поселке негде. Именно здесь милиция и выявила «валютчиков». Двое из них — соседи. С ними и ведем разговор.

— Да я никогда в жизни не считала, что российские рубли — это иностранная валюта, — искренне недоумевает социальный работник Елена Пехтерева (у нее на подворье три коровы, хотя недавно было четыре). — Какая заграница — вон же она, Россия, за кустами начинается! Доллары, евро — да, валюта. А российские… Мы же в Союзном государстве живем. А что касается телят, так некому их было отдать. Договоров с нами не заключали, сдать молодняк не предлагали, работники сельсовета не приходили. Если бы в хозяйстве принимали тогда, я бы знала, у меня мама в бухгалтерии работает. А здесь прослышали, что кто-то скупает, вот и попросили к нам заехать. Разговор шел о ценах в белорусских рублях. Потом, погрузив скот, покупатель сказал, что не успел обменять деньги и рассчитается российскими. Мы и не знали, что закон нарушаем. Никогда никто об этом не предупреждал. А назавтра — милиция. К Алесе вот к первой пришли…

Соцработник Елена Пехтерева, на попечении которой восемь немощных односельчан, и молодая мама Алеся Полощенко держат на своих подворьях по три коровы. Фото: "Рэспубліка"

Алеся Полещенко — молодая мама, воспитывает с мужем Андреем полуторагодовалого сынишку. В семье тоже осталось три коровы. По весне их было пять. Очень тяжело ухаживать за таким стадом. Тем более что появился малыш — он особого внимания требует. Пришлось сократить домашнее поголовье. В прошлом году подворье Алеси и Андрея было признано лучшим в районе — молодая семья продала государству 16 тонн молока!

— Милиционеры пришли с постановлением и потребовали выдать полученные от сделки деньги. Сказали, что лучше это сделать добровольно, чтобы не пришлось искать. Я и достала 8,4 тысячи российских рублей. Их забрали, а потом прислали повестку в суд, — Алеся, как и ее соседка, утверждает: знать не знала о том, что банкноты РФ — валюта.

Алексей Марковский спрашивает, почему не позвонили в райисполком тогда, когда решали судьбу телят? В любом случае здесь нашли бы варианты продать их на месте, в районе. По отчетам видно: местное хозяйство десять голов молодняка закупило у населения. Значит, принимали.

Третья деревенская «валютчица» — завфермой отделения «Полово» Галина Нежевичтоже ничего не слышала о приеме телят своим сельхозпредприятием. Утверждает, как и односельчанки: связываясь с предпринимателем, рассчитывала на оплату в белорусских рублях. А когда ей предложили российские, не стала требовать разгрузки автомобиля и возвращения теленка в сарай.

Еще одна фигурантка громкого дела — пенсионерка Валентина Петрухина из Городка. Бывшая сотрудница райплемстанции была вынуждена дорастить теленка до пяти месяцев. Валентина Андреевна перечислила мне несколько хозяйств, куда за это время безуспешно звонила с просьбой забрать бычка. Связывалась, по ее словам, и со специалистами райсельхозпрода. Посоветовали обратиться в Витебский район. А как туда теленка доставить? Обрадовалась, когда нашла телефон скупщика. В итоге 21 тысячу российских рублей, которые покупатель вместо заранее оговоренных белорусских денег оставил хозяйке, у нее изымали вместе с понятыми. Пенсионерка и теперь не может оправиться от стресса и позора, во время разговора то и дело начинает плакать, жалуется на постоянно высокие давление и сахар в крови.

— Сотрудники милиции пришли и спросили: «Вы вчера теленка продали?» Да, говорю, продала. «Деньги покажите!» — требуют. Я заволновалась: а что, фальшивые? Может, и фальшивые, говорят. Я и достала…

Ситуация неоднозначная. С одной стороны, люди нарушили закон. С другой — продавали не ворованное, а свое. Никому вреда не нанесли, а пойти на противозаконную сделку были вынуждены в силу обстоятельств и собственной неосведомленности. Думается, россиянин, которого тормознули с телятами на границе, тоже не предполагал, что его информация рикошетом ударит по людям. Он просто рассказал об обстоятельствах приобретения скота, чтобы доказать: не украл. Его, кстати, благополучно отпустили вместе с грузом, а за отсутствие ветеринарного свидетельства оштрафовали на 0,5 базовой величины.

— Наши сотрудники тоже не могли поступить иначе, — утверждает начальник Городокского РОВД Владимир Вороньков. — Незнание закона не освобождает от ответственности. Да, сельчан, в отношении которых были начаты административные процессы, не сравнить с валютными менялами, отирающимися у банков. Но и те, и другие подпадают под аналогичные статьи административного кодекса. Согласен, что информационно-профилактическая работа в этом направлении недостаточна. Обязательно еще раз выступим с разъяснениями в районной газете, вместе с представителями сельских Советов обойдем подворья, расклеим листовки. Особое внимание — жителям Межанского сельского Совета, на территории которого находится деревня Полово.

Детальный анализ ситуации после приезда журналиста состоялся и в райисполкоме. Глава района Петр Коробач предупредил всех руководителей предприятий и сельских Советов о недопустимости подобных фактов в будущем и необходимости оказывать всемерную поддержку тем, кто содержит приусадебные хозяйства. К каждому из них будут направлены ответственные лица сельисполкомов — им предстоит на месте ликвидировать информационный пробел в отношении действующего законодательства и выяснить, какие еще проблемы волнуют сдатчиков сельхозпродукции. Ведь с учетом того, что Городокский район находится в приграничье, этими проблемами уже завтра могут воспользоваться в своих, конечно, корыстных интересах предприимчивые дельцы.

В заключение остается добавить, что районный суд уже поставил точку в этой истории. Человечность и здравый смысл взяли верх. Принято решение за малозначительностью его прекратить, а изъятые деньги вернуть. В областном суде, куда дела сельчан были отправлены на последующее рассмотрение, подтвердили законность этого решения.

P. S. Когда материал был подготовлен к печати, нам сообщили: по выявленным недостаткам в работе с населением председатель Городокского райисполкома Петр Коробач инициировал рассмотрение вопроса о служебном несоответствии руководителя Межанского сельского Совета.

**Читать полностью: tut.by**

ДЭНАМІНАЦЫЯ

# ДОЖИЛИ!

**Не четыре нуля надо было убирать с белорусских купюр во время деноминации, а пять. Все пять! И тогда бы мы, как в зеркало, смогли посмотреть на свою нынешнюю жизнь.**

Так, проезд в общественном транспорте стоил бы не 5000 рублей старыми купюрами и не 50 копеек новыми, а знакомые с советских времен 5 копеек за билетик. Хороший ориентир, чтобы сравнивать.

16, 18, 20 копеек в советское время стоила буханка хлеба. Если применить хитрость с пятью нулями и ориентироваться не на нынешние фасовки, а на советский килограмм, то выяснится, что сейчас хлеб стоит примерно столько же. Но если копнуть глубже, то придется признать, что в общем и целом продукты за последние 25 лет очень подешевели. Так, в советское время 2 рубля стоил килограмм говядины, 2 рубля 10 копеек – килограмм свинины и баранины. Сейчас, если применить наш условный счет, гораздо лучшее мясо стоило бы где-то рубль сорок за килограмм. Вот только стали ли мы более сытыми?

За учебники мы платили? Нет. За школьные кружки, секции, факультативы? Нет. За анализ крови, за лечение зубов, за пребывание одинокого старика в доме престарелых?.. Нет, нет и еще раз нет. А сейчас за каждую малость – платим. Дошло до того, что кое-где на деревенских колодцах коммунальщики уже стали устанавливать счетчики воды. 25 лет назад кому про такое скажи – не поверили бы.

Только ни в коем случае не подумайте, что я ностальгирую по советским временам. Мы плохо жили. Страна, где люди вынуждены были покупать себе пальто или костюм на всю жизнь, в лучшем случае на десятилетие, – отвратительна и античеловечна. Но нельзя не признать, что государство все-таки брало на себя хоть какие-то обязательства перед людьми. Сейчас – никаких обязательств. Только дай, дай, дай...

Остался без работы – плати, остался одиноким в старости – плати, отдаешь ребенка в детский сад – покупай игрушки, книжки, туалетную бумагу; ребенок ходит в школу – оплати ремонт; ребенок занимается спортом – оплати его участие в соревнованиях... В тюрьме оказался – так и эту «услугу», предоставленную государством, теперь надо оплачивать! Втом, как обобрать людей, наше государство очень усовершенствовалось, уже просто меры не знает.

Вот только с чего платить? Если применить все тот же ход с пятью нулями, то выяснится, что при ценах, на многое сопоставимых с советскими, (кроме продуктов и спиртного), а на многое – даже больших, мы имеем значительно меньшую зарплату. Так, по последним данным статистики, средняя зарплата в Беларуси составляет 7 миллионов 182 тысячи рублей. Или 718 рублей 20 копеек деноминированными деньгами. Если бы отнимали пять нулей – коль уж мы именно таким счетом ищем эквиваленты с советским временем, – то это бы означало... 72 рубля. То есть зарплата меньше меньшего. Вот и ответ на вопрос, почему, даже имея 7 миллионов рублей зарплаты, теперь особо не разгуляешься. Хотя, как известно, и такой доход – это мечта для большинства граждан страны.

Почему так? Почему 25 лет со времен СССР прошло, войны не было, власть сильна и стабильна, народ все эти годы покорно выполнял то, что от него требовали, но стал беднее и беззащитнее? Четверть века – недостаточный срок? Тогда сколько времени нашей власти нужно, чтобы обеспечить не бла-бла-бла, а реальный рост благосостояния людей? Пятьдесят лет, девяносто, сто?.. Кто до этого светлого завтра доживет – наши дети, наши внуки, наши правнуки или никто?..

Нет, конечно, сегодня есть и те, кто в суровые советские времена и мечтать не мог о жизни нынешней. Например, недавно в интернете появилось видео из Монако, на котором любители редких и дорогих автомобилей засняли Mercedes G63 AMG Brabus B70, стоимость которого не бывает ниже 200 тысяч евро, а в зависимости от комплектации достигает и 500 тысяч. Номера – белорусские: «0101 МИ-7». Этот белорус наверняка хорошо живет, жизни радуется. Причем напомню, что буквы «МИ» на номерах указывают на «министерский статус». Вот только никто не может ответить на вопрос, какое министерство у нас настолько успешно, чтобы позволять себе такие авто? Какой госкомитет, чья администрация, какой чиновник?

Или сейчас идет суд по делу отца и сына Япринцевых. В суде в показаниях свидетелей уже не раз прозвучало слово «миллиардер». Может, Япринцев завод суперприбыльный построил, придумал прорывную технологию, доказал теорему Ферма? Нет, свои капиталы зарабатывал на придворном бизнесе – нефтепереработке. Будто государственные компании не в состоянии закупать в России сырую нефть, потом с большой прибылью продавать на Запад нефтепродукты и отдавать заработанное в бюджет. Однако суперприбыльный бизнес, как засвидетельствовал начавшийся суд, в нашем государстве почему-то оказался под контролем частных компаний – всяких Чижей и Япринцевых. И у последнего денег было столько, что сынок на Форексе умудрился проиграть 30 миллионов долларов. Не рублей – долларов!!! Потом влез в долги, кинул на деньги важных и известных людей, и в результате история дошла до суда.

В стране, где большинство населения балансирует между бедностью и нищетой, 32-летний мажор кидается десятками миллионов долларов!!! У вас такое в голове укладывается?..

А разве мог мечтать кто-либо из руководителей БССР, что он разведет в республике разлюли-малину для избранных, «обеспечит» провалы по всем показателям и обеднение людей, но при этом останется на своем посту да еще будет всех жизни учить? Не мог мечтать!

Я подозреваю, что именно поэтому при последней деноминации не пять нулей белорусские власти убрали с купюр, а только четыре. Чтобы параллели были не столь очевидны. Чтобы, запутавшись в нулях, не каждый осознал, до чего мы дожили...

**Светлана Калинкина**
**«Народная воля»**

ПАЛАТАЧНАЯ КАМПАНІЯ

# НІВОДНАГА ПРАДСТАЎНІКА РУХУ «ЗА СВАБОДУ» НЕ ЎКЛЮЧЫЛІ…

**Каманда першага намесніка старшыні Руху «За Свабоду» Юрася Губарэвіча накіравала 21 прадстаўніка ў участковыя выбаркамы 108 Каліноўскай акругі ў Мінску. Ніводны з іх, у тым ліку тыя, што збіралі за сябе подпісы, не быў уключаны ў склад камісіі.**

Усяго па 108-109 акругах былі пададзеныя 1160 заявак, распавёў сайту Рух.by сябра ініцыятыўнай групы Губарэвіча, які прысутнічаў на пасяджэнні адміністрацыі раёну, Алесь Славінскі.

Па яго словах, з іх 316 былі вылучаныя партыямі, грамадскімі аб'яднаннямі 563, зборам подпісаў 205.

«Кожную кандыдатуру зачытвалі асобна, акцэнтавалі увагу на нашых вылучэнцах, што досведу ўдзелу у камісіях не маюць, слаба ведаюць выбарчы кодэкс ці не з'явіліся на сумоўе. Тое ж самае па тых хто вылучаўся зборам подпісаў з 205 акцэнт зрабілі на шасці нашых вылучэнцах», — адзначыў актывіст Руху «За Свабоду».

«Улады пабачылі, што мы робім даволі моцную кампанію і пры сумленным падліку галасоў вынік можа быць не той, на які яны разлічваюць», — пракаментаваў сайту Рух.by вынікі фармавання камісіяў Юрась Губарэвіч.

Па ягоных словах, відавочна, што ў адміністрацыі быў правальваць іспыты. Як бы яны не стараліся імітаваць дэмакратычныя выбары, немагчыма гэта зрабіць, прымаючы тыя жрашэнні, што і раней, працуючы старымі метадамі пад час фармавання камісіяў і падліку галасоў. Першы этап — стварэнне выбаркамаў — паказаў, што нічога не мяняецца і мяняцца




дыферэнцыраваны падыход: падвышаная ўвага была да тых, хто можа падлічыць галасы «рэальна сумленна, не парушаючы закон, адкрыта для назіральнікаў».

«Улады працягвае не будзе: будзе імітацыя дэмакратычных выбараў, але гэта не больш чым спроба шулера прадэманстраваць сумленную гульню», — падкрэсліў Губарэвіч.

**Вольга Быкоўская**

КАМІСІЙНЫ ЗБОР

# 1 РУБЕЛЬ КАМІСІІ

**Вечарам 18 ліпеня прэс-служба Беларусбанка паведаміла, што ад 1 жніўня ў банку ўводзяць камісійны збор у памеры Br 1 за ўсе наяўныя плацяжы. Разбіраемся, што гэта азначае ў рэальнасці.**

**За што будуць браць 1 новы рубель?** Фактычна, за адзін падыход да касавага акенца. Ад 1 жніўня, калі вы захочаце аплаціць нейкія паслугі ў касах Беларусбанка, давядзецца да агульнай сумы дадаць адзін рубель. Пры гэтым няважна, адзін у вас рахунак, альбо адразу дзесяць. У абодвух выпадках банк папросіць у вас адзін рубель камісіі і не больш.

**Ці возьмуць камісію, калі я захачу пакласці ўсяго два рублі на рахунак мабільніка?** Так, возьмуць: касіру Беларусбанка давядзецца аддаць не два, а тры рублі. «Памер збору фіксаваны і не залежыць ад сумы плацяжу. У выпадку, які вы называеце, я б параіла скарыстацца тэрміналам самаабслугоўвання», — гаворыць у прэс-службе Беларусбанка.

**Што з тэрміналамі?** Тут усё нармальна і па-ранейшаму. Яны не будуць браць у вас камісію. Таму калі хочаце эканоміць і раней не карысталіся гэтымі дзіўнымі штуковінамі — самы час навучыцца.

**Ці давядзецца аддаваць рубель, калі я захачу памяняць валюту?** Не. Камісію Беларусбанк збірацца браць толькі за прыём плацяжоў, таму калі вы захочаце абмяняць рублі на еўра альбо еўра на рублі, ніхто ваш адзін рубель сабе не забярэ.

**Якія яшчэ ёсць выключэнні?** Выключэнняў даволі шмат. Камісія не будзе забірацца, калі вы захочаце перавесці грошы на дабрачыннасць, заплаціць па крэдыце, узятым у Беларусбанку, правесці плацеж праз касіра з дапамогай уласнай банкаўскай карткі. Таксама вызваленыя ад рублёвай камісіі ветэраны Вялікай Айчыннай вайны. Не возьмуць з вас рубля і тады, калі вы захочаце папоўніць свой уласны рахунак…

**Навошта ўсё гэта?** У Беларусбанку Еўрарадыё тлумачаць, што і так амаль апошнімі пайшлі на такі крок: «Толькі Белаграпрамбанк застаўся, усе даўно перайшлі на збор камісіі». Няцяжка таксама здагадацца, што такім чынам банкі спрабуюць абараніцца ад вялізных чэргаў ахвочых аплаціць камунальныя плацяжы. Магчыма, цяпер людзі насамрэч будуць вучыцца карыстацца іншымі метадамі аплаты.

**Ці законныя такія крокі банкаў?** З такім пытаннем звяртаемся да прэс-сакратара Нацыянальнага банка Аляксандра Цімашэнкі. Ён пацвярджае: гэта законны крок. Усе беларускія банкі могуць самастойна вызначаць памер камісіі, якую будуць збіраць за правядзенне плацежных аперацый.

**Алесь Пілецкі**
**«Еўрарадыё»**

НАША ЖЫЦЦЁ

# БІТЫ РЭАКТАР І ЧАРНОБЫЛЬСКІ СЦЭНАР

**Інцыдэнт на будаўнічай пляцоўцы беларускай АЭС здарыўся 10 ліпеня.**

Першапачатковая інфармацыя пра гэта пайшла ад актывіста АГП Мікалая Ўласевіча, які жыве ў Астраўцы. 25 ліпеня ён напісаў у Фэйсбуку: «Ня менш за дзясятак незалежных адна ад аднае крыніц на ўмовах ананімнасьці падчас правядзеньня мной пікетаў па зборы подпісаў пацьвердзілі факт падзеньня рэактара пры яго ўстаноўцы ў рэактарным аддзяленьні АЭС... На панядзелак (11 ліпеня. – Аўтар) плянавалася правядзеньне ўрачыстай, у прысутнасьці тэлебачаньня і іншых сродкаў масавай інфармацыі, цырымоніі ўсталяваньня рэактара на яго пастановачнае месца. Аднак 330-тонны агрэгат зь невядомых прычын сарваўся і зваліўся ўніз з вышыні ад 2 да 4 мэтраў».

У той жа дзень, 25 ліпеня, пра гэта напісалі незалежныя мэдыі. Журналісты задавалі пытаньні як дырэкцыі АЭС, так і Міністэрству энэргетыкі Беларусі, але адказаў не атрымалі. Прыхоўваньне інфармацыі пра інцыдэнт толькі больш узбуджала чуткі.

26 ліпеня літоўскі прэзыдэнт Даля Грыбаўскайце выступіла з заявай, што асьцярогі Літвы наконт бясьпекі будаўніцтва атамнай станцыі былі абгрунтаваныя. Яна таксама заявіла, што калі Беларусь ня зробіць захадаў, каб гарантаваць міжнародныя стандарты бясьпекі, то Літва разам зь міжнароднай супольнасьцю пастараецца не дапусьціць працы АЭС.

У той жа дзень генэральны падрадчык будаўніцтва БелАЭС — расейскае акцыянэрнае таварыства «Атамбудэкспарт» — выступіў зь нейкай нязграбнай заявай, нібыта «інфармацыя пра надзвычайнае здарэньне на будоўлі ў Астраўцы Беларускай АЭС не адпавядае рэчаіснасьці», што «корпус рэактара знаходзіцца за межамі рэактарнага аддзяленьня».

То бок, у перакладзе на звычайную мову, нічога не было. Гэта стандартная рэакцыя дзяржаўных структур сёньняшняй Расеі. Вайна ў Данбасе? Мы ні пры чым. Навошта вы бамбіце ў Сырыі не Ісламскую дзяржаву, а апазыцыю сырыйскаму прэзыдэнту Асаду? Не, гэта ня мы, мы бамбім толькі ісламістаў. Расейскія спартоўцы масава прымаюць допінг? Не, гэта дваістыя стандарты, падкопы ворагаў, якія толькі і мараць, каб нашкодзіць Расеі.

Але праз кароткі час у той жа дзень, 26 ліпеня, Міністэрства энэргетыкі Беларусі было вымушана прызнаць, што «няштатная сытуацыя здарылася на пляцоўцы захоўваньня корпуса рэактара пры правядзеньні такеляжных працаў па яго перасоўваньні ў гарызантальнай плашчыні». Нарэшце, больш як праз два тыдні пасьля аварыі!

У заяве Міністэрства энэргетыкі ёсьць і яшчэ адзін цікавы сюжэт. Там паведамляецца, што дырэкцыя станцыі «неадкладна запатрабавала ў генэральнага падрадчыка ўсе неабходныя дакумэнты і зьвесткі». То бок высьвятляецца, што ні Міністэрства энэргетыкі Беларусі, ні дырэкцыя АЭС не валодаюць інфармацыяй, што адбываецца на станцыі, што там робяць расейскія будаўнікі!!!

У гэта цяжка паверыць, але з боку беларускай дзяржавы няма кантролю за самым небясьпечным аб'ектам у краіне! Гэта ў Беларусі, дзе дзяржаўныя органы сочаць за кожным іпэшнікам, за кожным здавальнікам кватэры, дзе КДБ, як нядаўна прызнаўся яго старшыня, сочыць за тым, як апазыцыянэры зьбіраюць подпісы. Гэта называецца, прыехалі!

Узьнікае натуральнае пытаньне: ці можна цяпер выкарыстоўваць гэты рэактар, які ляснуўся з вышыні чатырох мэтраў? То бок — няўжо расейцы ўвапхнуць беларусам біты рэактар?

Нагадаем, у сярэдзіне красавіка на Астравецкай АЭС абрынуліся стойкі будучага будынка ядзернага абслугоўваньня. Пра гэта стала вядома толькі ў траўні ад аднаго рабочага. Улады прызналі інцыдэнт толькі празь месяц і толькі пасьля таго, як тлумачэньняў запатрабавала Літва.

То бок беларускія ўлады паводзяць сябе з абсалютнай дакладнасьцю так, як савецкія ўлады пасьля катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Усё хаваюць, і толькі пасьля таго, як пра гэта гучна загавораць за мяжой, скрозь зубы паведамляюць, што нешта адбылося, але ўсё ў парадку, сытуацыя пад кантролем.

Дарэчы, пасьля аварыі ў Чарнобылі савецкія ўлады адрэагавалі раней. Катастрофа здарылася 26 красавіка, а ўжо 28 красавіка галоўная інфармацыйная праграма савецкага тэлебачаньня — «Время» — паведаміла, што на Чарнобыльскай АЭС здарыўся няшчасны выпадак, пашкоджаны рэактар. То бок у СССР адрэагавалі праз два дні, у лукашэнкаўскай Беларусі — больш як праз два тыдні.

Недэмакратычныя рэжымы, якія непадкантрольныя грамадзтву, па-іншаму сябе паводзіць ня могуць. Навошта народу ведаць пра небясьпеку? Ня трэба бударажыць, нічога,ператопчуцца. Калі толькі было прынятае рашэньне пра будаўніцтва Беларускай АЭС, я пісаў, што, акрамя ўсіх іншых прычын, нельга будаваць такі небясьпечны аб'ект у недэмакратычнай краіне, бо калі народ не кантралюе ўладу, можа паўтарыцца чарнобыльскі сцэнар. Але ня мог уявіць, што мае змрочныя прагнозы спраўдзяцца так хутка.

Ужо цяпер можна лёгка ўявіць, як будзе паводзіць сябе кіраўніцтва Беларусі, калі, крый Божа, здарыцца аварыя зь ядзерным рэактарам, які ўжо будзе працаваць. На гэтым тле зусім па-іншаму выглядаюць перасьцярогі і з боку Літвы, і з боку экалягічных рухаў. Няўжо і цяпер ні грамадзкасьць, ні апазыцыя ніяк не адрэагуюць?

**Валер Карбалевіч**
**"Радыё Свабода"**

ІНТЭРВ'Ю ГАННЫ

# "БЫТЬ С ЛЮБИМЫМ В ОДНОЙ КЛЕТКЕ — ЭТО МУКА"

**В эксклюзивном интервью «Комсомолке» экс-сенатор Анна Шарейко рассказала, как устала от слежек перед арестом и изменила ли ее колония.**

Два года экс-сенатор и гендиректор известной птицефабрики «Ганна» Анна Шарейко вместе со своей командой провела за решеткой. Особое внимание было приковано к литовскому бизнесмену Вальдемарасу Норкусу, деловому партнеру и любимому человеку Анны Васильевны, который тоже вместе с ней оказался за решеткой. Даже во время процесса они не скрывали чувств, нежно смотрели друг на друга и попросили расписать прямо в СИЗО. Верховный суд фигурантов громкого дела признал виновными, но отпустил в зале суда всех, кроме Норкуса. Он вышел на свободу спустя месяц, 9 июля. В эксклюзивном интервью «Комсомолке» Анна Шарейко и Вальдемарас Норкус рассказали, изменила ли их колония, что оказалось самым сложным за решеткой и когда они сыграют свадьбу.

— Проходите, — приглашает нас спустя некоторое время Анна Шарейко.

Смена картинки настолько поразительна, что сразу теряешься. Еще полтора месяца назад журналисты видели ее за решеткой, и ей грозил солидный срок, сегодня она снова руководитель крупного предприятия. Выглядит как дама с обложки: облегающий стройную фигуру костюм, туфли на высоких каблуках, французский маникюр. Признается, что ее смущает внимание, которое к ней сейчас приковано. А люди узнают везде: и в Витебске, и в Минске.

**— Анна Васильевна, о чем больше всего мечталось за решеткой?**

— Очень хотелось нажарить сковородку яичницы! (Смеется.) А если серьезно, безумно скучала по родным, по их голосам. За два года в СИЗО мне не дали ни одного свидания. Наверное, думали, так легче сломать человека. Но только не меня. Да, я сильно скучала, но держалась изо всех сил. Когда в суде впервые услышала голоса близких мне людей, они еще сутки звучали в ушах.

**— Как вы провели свой первый день на свободе?**

— Собрались все родственники, друзья, дети Валдаса и его отец, устроили душевную встречу! Общались до самой поздней ночи. Но радость омрачало то, что за решеткой остался мой любимый человек. Больше всего мне хотелось оказаться на свободе вместе с ним. Знаете, сидеть рядом в суде за стеклом, при этом нельзя друг друга потрогать, обнять — это мука. Думаешь, ну когда наступит то время, чтобы никто этого не запрещал? И не ругался за это...

Сейчас каждый день общаемся с ним по скайпу, вижу, как дети от него не отходят. Хоть они уже взрослые люди, но такие счастливые рядом с ним, как малые дети.

**«На обыски я смотрела как на концерт»**

**— Этот приговор стал для вас неожиданностью?**

— Свободой запахло, когда прокурор отказался от того, что мы нанесли ущерб в 4 миллиарда рублей и якобы действовали в составе организованной группы. Я до конца не понимала, что происходит, и, услышав про срок в 2,5 года лишения свободы, поняла: мы скоро выйдем на свободу. Правда, до конца верила в оправдательный приговор. Даже за решеткой продолжала жить фабрикой, поэтому, как только нас освободили, вышла на работу.

**— Фотографии того, как подчиненные встречают вас пирогом с солью и цветами, разлетелись по многим СМИ. Было удивительно видеть, что вместе с вами вышли даже те осужденные, которые накануне говорили, что больше на работу ни ногой.**

— В первый день после освобождения мы все, кроме Лиоренцевича (фигурант уголовного дела и бывший сотрудник «Ганны». — Ред.), вышли на работу. Встретились на крыльце здания, и я еще смеялась: «Ну что, организованная группа, заходите, пообщаемся». Каждый из них честно признался, что вернуться на "Ганну" больше не может. Они достойно прошли это испытание, но какой ценой им это далось, никому не известно. Я очень благодарна, что меня окружали специалисты такого высокого уровня, настоящие профессионалы.

**— Решение ваших подчиненных кажется более логичным. Многие были уверены, что вы соберете чемодан и рванете к любимому в Каунас.**

— Я по жизни бегу туда, где надо спасать. К примеру, если у моих друзей и близких все хорошо, я не слишком балую их вниманием, но вдруг что-то случается, тут же мчусь на помощь. Коллектив поддерживал нас все это время и ждал возвращения, я не смогла поступить иначе, кроме того как вернуться на фабрику. Не даю никому 100% гарантии, что смогу вернуть прежнее предприятие, слишком много упущено, но я постараюсь, используя свои знания и опыт.

**— Наблюдая за вами все три месяца, пока шел суд, гадала: как вы переносите заключение? Вы человек энергичный, деятельный, руководитель крупного предприятия — и вдруг оказываетесь в замкнутом пространстве. Порой казалось, что вы прямо в клетке готовы провести планерку, дать указания, решить все вопросы.**

— На суд мы ездили как на работу. Готовились к допросам, показаниям свидетелей, изучали необходимые документы. За два года возможности пообщаться не было, но в суде поняла: никто времени зря не терял, все выстроили грамотную линию защиты. Лично я знакомилась с материалами уголовного дела с 9 утра и до 8 вечера, без обеда, только маленький перекус брала. И так 30 дней. Я хотела его изучить вдоль и поперек. Видела, как защищались мои коллеги, и отметила еще раз для себя, какие они молодцы. И стойкие, и мужественные, и порядочные, и грамотные.

**«В рапорте напишут, будто я хотела бежать из туалета Совета Республики»**

**— Анна Васильевна, вы знали, что летом 2014 года над вами сгущаются тучи?**

— Нет, это было полной неожиданностью. К обыску не готовилась, ничего не скрывала, сама назвала код от сейфа. Я работала честно и открыто, мне нечего было бояться. За 15 лет работы в должности руководителя мой кабинет ни разу не закрылся на ключ, нет ни одной тумбочки на замке. Мой дом обнесен обычной сеткой, целый год я не вешала шторы... У меня нет необходимости прятаться. Ну что у меня нашли в сейфе? Фотографии.

*Продолжение интервью читайте на сайте «Комсомольской правды в Белоруссии»*

**Катерина Борисевич**
**«КП в Беларуси»**

**Заснавальнік і рэдактар:** Гаравы Леанід Антонавіч

**Адрас рэдакцыі:** 211573, г. Гарадок, вул. Гагарына, д.30Б, кв.16. E-mail: 250318@list.ru
Тэл. 8-02139-5-08-52, маб. + 375(29)6723842 (V),
Газета выдаецца з сакавіка 1998 г.

**Падпісана да друку 29.07.2016 у 19.30**
Наклад: 290 асобнікаў.
Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Друкуецца на абсталяванні аднадумцаў.
Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.